**С. Я. Новікаў**

# ВІЗУАЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ МІНСКАГА ІНЯЗА: МАЎКЛІВЫЯ СВЕДКІ ЦІ ЖЫВЫЯ КРЫНІЦЫ МІНУЛАГА

Гісторыя Мінскага іняза ў адлюстраванні фота – патрэба ў такім поглядзе на цяперашні час больш чым відавочная на падставе таго, што ў адпаведнасці з канцэпцыяй стварэння музея гісторыі ўніверсітэта на першым паверсе ў корпусе “Б” (галоўным корпусе) з’явілася галерэя гістарычных фотаздымкаў. Нагадаем чытачу, што ў фондах самога музея захоўваюцца дзясяткі ці сотні фота, якія ў сваёй большасці да гэтага часу застаюцца нямымі сведкамі мінулых падзей. Аб важнасці ўсебаковай інтэрпрэтацыі кожнага з захаваных фота, іх дакладнай прывязкі да гістарычнага кантэксту і аб’ектыўнага аналізу зафіксаваных фактаў з максімальна поўнай ідэнтыфікацыяй персон на фота аўтар упершыню пісаў на старонках навуковага артыкула, які ў бягучым годзе быў падрыхтаваны ў сааўтарстве з А. Г. Цымбалам і апублікаваны ў чарговым нумары Весніка МДЛУ (24/2025, серыя 3). Галоўны вынік публікацыі аўтары бачаць у тым, што сённяшнія наведвальнікі фотагалерэі ў галоўным корпусе застаюцца з адной думкай: на сценах калідора вісяць маўклівыя сведкі гісторыі Мінскага іняза ці жывыя крыніцы непаўторнага мінулага інязаўцаў?

Кожны з нас, хто знаёміцца з 19 фотаздымкамі, размешчанымі наўздоўж дзвюх сцен на першым паверсе ў памеры стандартнага ватману, адразу ж акунаецца ў гістарычную прастору часу, зафіксаванага ў самых розных сюжэтах: ад паказу студэнтаў на занятках па фанетыцы, перакладу ці граматыцы, да іх удзелу ў маштабных мерапрыемствах накшталт першамайскіх дэманстрацый з удзелам прадстаўнікоў працоўнага калектыву. Апроч таго, у пералік згаданых фотаздымкаў уваходзяць фота, на якіх сённяшні чытач бачыць студэнтаў у паўнюткай актавай зале, перад уваходам у інстытут з удзельнікамі велапрабегу, на іншых спартыўных мерапрыемствах, а таксама на месцы калектыўнай памяці, створаным намаганнямі студэнтаў і выкладчыкаў Мінскага іняза ў раёне Гатава як помнік аб вызваленні Мінска ў ходзе аперацыі “Баграціён” летам 1944 г. Адзначым, што якраз гэтым фота пачынаецца галерэя гістарычных фотаздымкаў. Зразумела, што сярод фота можна ўбачыць будынкі вучэбных карпусоў, узведзеных у рамках фарміравання вучэбнага кампуса інстытута цягам 1950-х–1960-х гадоў. Атрымліваецца, што перад наведвальнікам разгортваецца маўклівая гісторыя падзей інязаўскага паўсядзённага жыцця, адлюстраванага ў фотаздымках. Але наколькі адэкватна тыя падзеі могуць інтэрпрэтаваць сённяшнія студэнты, у якой ступені кожнае фота стварае даступны для цяперашняга часу візуальны наратыў, ці могуць яны быць цалкам інтэграванымі ў гісторыю Мінскага іняза? Інакш кажучы, у якой ступені кожны з фотаздымкаў можна класіфікаваць як візуальную крыніцу па гісторыі Alma Mater? Пытанні, якія ўзнікаюць пасля агульнага знаёмства з вывешанымі фота.

Спынімся на некаторых з іх. На погляд аўтара гэтых радкоў, важнае месца ў галерэі іх займаюць два фотаздымкі, якія знаёмяць нашага наведвальніка з тэлестудыяй ці лабараторыяй вучэбнага кіно і тэлебачання Мінскага

іняза. Як успамінала пра той час Н.Г. Краснова, у педагагічнай ВНУ было створана і дзейнічала "інстытуцкае тэлебачанне". У пералік задач гэтага цэнтра ўваходзіла не толькі правядзенне перадач з мэтай палітычнага інфармавання па актуальных пытаннях міжнароднага палажэння, унутранай і знешняй палітыкі савецкай краіны, у тым ліку БССР, але і забеспячэнні вучэбнага працэсу, прэзентацыі новай паступленняў літаратуры ў бібліятэку інстытута і інш. Адзначым, што яны ў часы перазменкі студэнтаў рэгулярна трансліраваліся на цэнтральны хол інстытута (сёння галоўны ўваход). Апроч гэтага спецыялісты тэлестудыі шырока выкарыстоўвалі спадарожнікавыя антэны і запісвалі розныя праграмы перадач на замежных мовах, якія потым выкарыстоўвалі ў якасці вучэбнага матэрыялу. Як бачна, на адным з фотаздымкаў праводзіцца чарговая перадача ў рамках плана палітычнага інфармавання студэнтаў і выкладчыкаў Мінскага іняза.

Другім здымкам[1], які знаходзіцца ў значна большай ступені ў фокусе нашага аналізу, з'яўляецца фота з TV-застаўкай і абрэвіятурай "МГПИИЯ". На гэтым фоне разгортваецца наш расповед. Як бачна, на фотаздымак патрапілі 8 персон, палова з якіх у сядзячым палажэнні, другая – стаяць у памяшканні тэлестудыі. Галоўнай дзеючай асобай, якая на здымку знаходзіцца побач з рэктарам Н.Г. Красновай, з'яўляецца Соня Гандзі – супруга Прэм'ер-міністра Індыі Раджыва Гандзі, якая ў складзе афіцыйнай дэлегацыі наведала Мінск у маі 1985 г. Заўважым, што на момант прыёму высокіх гасцей у Мінскім інязе сам кіраўнік ураду ўскладаў кветкі і сустракаўся са студэнтамі інстытута і іншых навучальных устаноў горада побач з Мінскім інязам – на Плошчы Перамогі, тым самым ганараваў дату 40-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Якраз у гэты час Соня Гандзі знаходзілася ў Мінскім інязе, дзе яе чакала невялікая праграма сустрэчы, у тым ліку прыём дэлегацыі на тэлестудыі з удзелам рэктара інстытута Н.Г. Красновай. Сёння можна толькі шкадаваць, што гэта сустрэча не была запісана на відэастужку і потым не дэманстравалася ў час палітінфармавання. Між тым, аўтар артыкула ставіць перад сабой задачу не толькі па агульным аналізе фота, але і інтэрпрэтацыі яго зместу. Мы зыходзім з таго, што складваецца пэўны гістарычны наратыў фота, які стане больш даступным для нашага чытача і нашых студэнтаў у тым выпадку, калі ўдасца асабіста ідэнтыфікаваць кожную з сфатаграфаваных персон. Працягнем знаёмства з тымі, хто ўваходзіць у склад дэлегацыі, якую прымаюць на тэлестудыі. Зразумела, што ў цэнтры здымка будзе знаходзіцца не толькі высокая госця – Соня Гандзі, але і неад'емлемы персанаж сустрэч з замежнымі гасцямі – перакладчык. У нашым выпадку гэта бліскучы майстар англамоўнага перакладу, выкладчык перакладчыцкага факультэта Эдуард Міхайлавіч Пракаповіч. Побач з ім сядзіць прадстаўнік факультэта англійскай мовы – старшы выкладчык З.Дз. Пятрухіна[2], на той час старшыня прафкаму.

[1] Аўтар выказвае шчырую падзяку прафесару кафедры мовазнаўства Л. М. Ляшчовай за інфармацыйную падтрымку.

[2] Аўтар шчыра ўдзячны вядучаму спецыялісту Г. Л. Ціхановіч і дацэнту кафедры інтэнсіўнага навучання ІПКіП Т. Г. Папко за дапамогу ў ідэнтыфікацыі асоб на здымку.

У дачыненні да другой групы персон, зафіксаваных на фота, аўтар прапануе наступную інтэрпрэтацыю. Пачнём разгляд з асобы, якая стаіць злева ад рэктара Н.Г. Красновай, але пры гэтым звяртаецца з нейкім пытаннем да Э.М. Пракаповіча. Па рэакцыі на пастаўленае пытанне бачна, што на яго адрэагавалі не толькі Соня Гандзі, Э.М. Пракаповіч, З. Дз. Пятрухіна, але і іншыя прадстаўнікі замежнай дэлегацыі, якія былі ў яе складзе, але стаялі крыху воддаль ад галоўнай госці сустрэчы. На наш погляд, зроблены зварот належыць сакратару парткама дацэнту А.Г. Кірпічовай, тады як прадстаўнік беларускага МЗС, які стаіць насупраць, не звяртае аніякай увагі на прагучаўшыя словы, паколькі характар звароту не меў дачынення да яго службовых абавязкаў. На жаль, нам не ўдалося высветліць штосьці пра гэту асобу, як і тых двух асоб з дэлегацыі Індыі, якія стаялі побач. Такім чынам, праведзены прыём дэлегацыі Індыі ў МДПІЗМ быў арганізаваны адпаведнымі службамі міністэрства пры падтрымцы кіраўніцтва інстытута ў асобе рэктара Н.Г. Красновай.

Хаця ў дачыненні да некаторых удзельнікаў сустрэчы ў аўтара гэтага артыкула на гэты час застаюцца адкрытыя пытанні, аднак праведзены пошук дае падставы для высновы, што галоўную задачу па апісанні фота з ідэнтыфікацыяй галоўных дзеючых асоб намі выканана. Хаця частка гэтай групы, асабліва тых, хто ўваходзіў у склад дэлегацыі з боку Міністэрства замежных спраў БССР і высокіх гасцей з Індыі, для нас пакуль што застаюцца невядомымі. Гэта азначае не што іншае, як неабходнасць працягу аўтарскага даследавання з выкарыстаннем іншых дакументальных крыніц дзеля таго, каб даць адказы на ўсё існуючыя пытанні. У гэтым сэнсе аўтар вяртае чытача ў пачатак артыкула, дзе размова ідзе пра новую публікацыю ў Весніку МДЛУ, прысвечаную менавіта такой жа мэце – пераўтварэнні маўклівых фота ў жывыя крыніцы гісторыі Мінскага іняза. Знаёмства чытача з публікацыяй, у тым ліку вывучэнне зместу фота, якое не патравіла ў галерэю фотаздымкаў на сценах галоўнага корпуса, пераканае кожнага ў важнасці правядзення такой работы ў дачыненні да іншых фота з выкарыстаннем методыкі правядзення паступовага шматкрокавага аналізу фота з адной толькі мэтай – пераўтварэння яго ў жывую крыніцу гісторыі Мінскага іняза.

У заключэнні кароткага аналізу аўтар прапануе некалькі высноў, асабліва важных для далейшага працягу навуковага даследавання аб’ектаў візуальнай гісторыі Мінскага іняза. Пераўтварэнне маўклівых сведкаў мінулага ў крыніцы жывога мінулага, у першую чаргу з пункту погляду вяртання імёнаў былых інязаўцаў у галерэю памяці, гонару і гісторыі, патрабуе неадкладнага вырашэння наступных задач: 1) працягу навуковай працы па “ажыўленні” фота для іх уключэння ў візуальную гісторыю мінскіх інязаўцаў; 2) уключэння жывой гісторыі з кожнага фота галерэі шляхам надання ім асобных кюар-кодаў; 3) аздабленні фотаздымкаў такімі інфармацыйнымі кропкамі з мэтай адкрыцця доступу да належнай інфармацыі аб гісторыі фота.